создают возможность глубже понять и определить ценностное значение культурных объектов, а также вовлечь широкую аудиторию в деятельность по сохранению и продвижению объектов культурного наследия. Этот синергетический подход, сочетающий традиции и современные технологии, способствует сохранению культурного наследия для будущих поколений и обеспечивает его увековечение в цифровом пространстве.


*1.* Государственная программа «Культура Беларуси» на 2021–2025 годы» [Электронный ресурс] : утв. постановлением Совета Министров Респ. Беларусь, 29.01.2021 г., № 53 // Нац. правовой интернет-портал Респ. Беларусь. – Режим доступа: https://pravo.by/document/?guid=3871&p0=C22100053. – Дата доступа: 25.11.2023.

*2.* Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры [Электронны рэсурс] : 20 ліп. 2016 г., № 413-З : прыняты Палатай прадстаўнікоў 24 чэрв. 2016 г. : адобр. Саветам Рэсп. 30 чэрв. 2016 г. // Нац. правовой интернет-портал Респ. Беларусь. – Режим доступа: https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=Hk1600413. – Дата доступа: 25.11.2023.


УДК 338.483.12:7.079(476)


Д. С. Жук,
*група 350,*
*установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», Мінск, Беларусь*


## АЎГУСТОЎСКІ КАНАЛ ЯК ЦЭНТР ФЕСТЫВАЛЬНАГА ТУРЫЗМУ

Турысцка-рэкрэацыйны парк «Аўгустоўскі канал» быў створаны ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 220 ад 26 мая 2011 г., і функцыі па кіраванні паркам былі ўскладзены на адміністрацыю СЭЗ «Гроднаінвест». У лістападзе 2011 г. Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь зацвердзіў Праграму развіцця спецыяльнага турысцка-рэкрэацыйнага парку «Аўгустоўскі канал» на 2012–2015 гг. з аб’ёмам фінансавання не менш за 8845 млн рублёў (пастанова Савета Міністраў ад 21 лістапада 2011 г., № 1564) [4].

Гідратэхнічныя збудаванні – гэта інжынерныя канструкцыі, прызначаныя для кіравання воднымі рэсурсамі, водазабеспячэння, дрэнажу, арашальных сістэм і іншых водных працэсаў.

Яны ўключаюць такія элементы, як плаціны, шлюзы, каналы, помпавыя станцыі, вадасховішчы і дрэнажныя сістэмы. Гідратэхнічныя збудаванні іграюць важную ролю для функцыянавання і захавання Аўгустоўскага канала, а таксама для забеспячэння бяспекі і зручнасці падарожнікаў і жыхароў [3].

Ідэя стварэння канала з'явілася ў 1760–1770-я гг. у часы караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага. Праект, распрацаваны ваеннымі інжынерамі ў пачатку XIX ст., быў адобраны імператарам Аляксандрам I (1824). Будаўніцтва Аўгустоўскага канала заняло 15 гадоў і ўключала ў сябе 29 водапрапускных плацін, 18 шлюзаў, 21 камеру, 14 мастоў і 24 аб'екты для абслугоўвання. Яго гісторыя як значнай транспартнай артэрыі для сплаву драўніны і тавараў аказалася нядоўгай. У 1825 г. пагадненне з Прусіяй урэгулявала мытныя пошліны, а ў другой палове XIX ст. развіццё чыгунак зрабіла канал незапатрабаваным для перавозак [2].

Тым не менш Аўгустоўскі канал стаў папулярным турыстычным напрамкам, таму што пралягае па маляўнічых мясцінах. Першая пешая экскурсія ўздоўж рэчышча канала была арганізавана ў 1909 г., а пазней быў адкрыты конны маршрут. У 1920–1939 гг. канал зноў прымаў падарожнікаў: тут курсіравалі два колавыя параходы, развіваўся байдарачны турызм, працавалі яхт-клубы. У раёне шлюза Дамброўка праводзілася грандыёзнае «Свята мора». У гэты перыяд выйшаў першы турыстычны даведнік па Аўгустоўскім канале.

У гады Вялікай Айчыннай вайны гідратэхнічныя збудаванні канала, уздоўж якога былі пабудаваны абарончыя доты, значна пашкоджаны, а размеркавальны шлюз Чарток увогуле разбураны [2].

Аўгустоўскі канал быў часткай добра развітай сістэмы ўнутраных водных шляхоў Еўропы. Ён забяспечваў перавозку грузаў з басейнаў рэк Віслы і Нёмана да Балтыйскага мора. Водныя шляхі басейнаў Віслы і Нёмана таксама былі звязаны з Чорным морам праз канал Агінскага з басейнам Дняпра, затым па Дняпры і праз Бярэзінскі канал з ракой Дзвіною [1].

У 2004–2006 гг. беларускі ўчастак канала (22 км) цалкам адрэстаўравалі. Спецыялісты аднавілі рэчышча, якое не выкарыстоўвалася з 1950-х гг., падмытыя і абрушаныя ўчасткі, старажытныя гідратэхнічныя збудаванні. Многія элементы – шлюзы і мемарыяльныя таблічкі з імёнамі інжынераў-праекці-

роўшчыкаў, драўляныя калоны і разводныя масткі – рэстаўраваліся ўручную і захавалі аўтэнтычны выгляд. У 2005 г. пачаў працаваць міжнародны пункт пропуску праз беларуска-польскую мяжу «Лясная – Рудаўка» для турыстаў на лодках і байдарках (сезонны).

Сёння на беларускай частцы старажытнага канала дзейнічаюць 5 шлюзаў-рэгулятараў, 2 плаціны і суднаходныя шлюзы Нямнова, Дамброўка, Валкушак (шлюз Кужынец – на мяжы Беларусі з Польшчай). Самы вялікі шлюз Аўгустоўскага канала – чатырохкамерны Нямнова, даўжыня якога – 9,6 м. Перапад вады складае амаль 10 м, а шлюзаванне займае каля гадзіны.

Сёння на тэрыторыі Аўгустоўскага канала праходзіць мноства мерапрыемстваў, у тым ліку адкрытае рэгіянальнае свята народнай творчасці «Аўгустоўскі канал запрашае сяброў», прысвечанае святкаванню 200-годдзя Аўгустоўскага канала. У час мерапрыемства прадстаўлена мноства інтэрактыўных конкурсаў: спаборніцтвы рыбакоў і «Бітва лесарубаў»; чэмпіянат па колцы дроў сярод аматараў-мужчын і жанчын; работа атракцыёнаў, выязнога гандлю, а таксама гастрафэст страў беларускай нацыянальнай кухні (прэзентацыя і майстар-класы па прыгатаванні).

Ужо пяты год запар на Аўгустоўскім канале 5 ліпеня праводзіцца мастацкая рэканструкцыя абраду «Купалле». Падчас мерапрыемства наведвальнікі акунаюцца ў атмасферу самага загадкавага і чароўнага свята праз тэатралізаваны паказ з выкарыстаннем элементаў старажытных купальскіх абрадаў. Маладыя людзі збіраюцца, каб паваражыць на суджаных, адправіцца на пошукі папараць-кветкі, а таксама далучыцца да традыцыйных дзействаў: скакануць праз вогнішча і пусціць вянкі па вадзе. Увечары, калі шлюз апускаецца, народныя калектывы клубных устаноў даюць магчымасць аматарам паўдзельнічаць у конкурсах на «Самы прыгожы вянок» і «Самую доўгую касу», а таксама ў майстар-класе па бытавых танцах.

Жнівеньскае мерапрыемства «Свята мора – 2023» уключала шэсце з галоўнымі героямі Няптунам і яго марской світай. «Марская» тэматыка мерапрыемстваў прасочваецца ў правядзенні чэмпіянату па балотным футболе. У гэты дзень на шлюзе Дамброўка арганізавана мноства лакацый з конкурсамі, квэст-гульнямі, гульнявымі і інтэрактыўнымі праграмамі, спар-

тыўнымі гонкамі на катамаранах, выступленнямі артыстаў Гродзеншчыны, а таксама вячэрняй танцавальна-забаўляльнай праграмай і пеннай вечарынкай.

Дваццаць шостага жніўня прайшоў абласны адкрыты фестываль народнай творчасці «Аўгустоўскі канал у культуры трох народаў». Мерапрыемства праходзіла на шлюзе «Дамброўка». На сцэне выступалі творчыя калектывы Гродзенскай вобласці, якія захоўваюць народныя традыцыі беларускай, літоўскай і польскай культур. Цэнтрам фестывалю стала касцюміраванае шэсце да галоўнай пляцоўкі. Таксама адбылася прэзентацыя самай вялікай «фестывальнай булкі». На сцэнічнай пляцоўцы «У сяброўстве, адзінстве і згодзе» госці фестывалю прымалі ўдзел у майстар-класе па бытавых танцах, у конкурсе ігры на музычных інструментах – баяне, акардэоне і гармоніку. На лаўндж-пляцоўцы «Нацыянальны каларыт» госці танцавалі, спявалі папулярныя хіты. Актывізаваў удзельнікаў фестывалю праект «Пабудуем Аўгустоўскі канал разам», дзе яны маглі размаляваць шлюзы, байдаркі і лодкі, прапанаваць свой праект.

Зыходзячы з пералічанага вышэй, лічу мэтазгодным прапанаваць праект «Вдоль-Фест», які можна рэалізаваць на Аўгустоўскім канале (уключаны ў папярэдні Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА) у фармаце фестывалю, што дасць удзельнікам унікальную магчымасць далучыцца да разнастайных мерапрыемстваў, якія будуць праводзіцца на чатырох цеплаходах, што рухаюцца паслядоўна. На першым цеплаходзе наведвальнікі атрымаюць асалоду ад канцэртаў, на якіх выступяць у розных музычных жанрах вядомыя музыканты і таленавітыя маладыя выканаўцы. На другім цеплаходзе будуць праводзіцца лекцыі і майстар-класы. Трэці цеплаход прапануе ўнікальную магчымасць пакаштаваць стравы XIX ст. На чацвёртым цеплаходзе з тэатральным павільёнам пройдуць спектаклі розных жанраў. Плануецца, што цеплаходы будуць прышвартоўвацца да берага раз у гадзіну, каб кожны ўдзельнік фестывалю мог перайсці з судна на судна, тым самым у поўнай меры атрымаць асалоду ад мерапрыемстваў і паслуг, прадстаўленых у рамках праекта.

---

*1.* Августовский канал [Электронный ресурс] // Belarus.by. – Режим доступа: https://www.belarus.by/ru/travel/belarus-life/augustow-canal. – Дата доступа: 01.12.2023.

*2.* Августовский канал [Электронный ресурс] // Гродненский районный исполнительный комитет. – Режим доступа: https://grodnorik.gov.by/ru/august_kanal-ru. – Дата доступа: 01.12.2023.

*3.* Государственный стандарт Союза ССР. Гидротехника. Основные понятия [Электронный ресурс] // Электронный фонд правовых и нормативно-технических документов. – Режим доступа: https://docs.cntd.ru/document/1200009458?ysclid=lpp99do48q41315612. – Дата доступа: 01.12.2023.

*4.* Туристско-рекреационный парк «Августовский канал» как объект коммеморативных практик [Электронный ресурс] // Репозиторий Полоцкого гос. ун-та имени Евфросинии Полоцкой. – Режим доступа: https://elib.psu.by/bitstream 123456789/27548/1/Пивоварчик%20С.А._с-70-73.pdf. – Дата доступа: 01.12.2023.

УДК 304.444-053.81:316.7

К. А. Квятко,
*группа 411,*
*учреждение образования «Белорусский государственный университет культуры и искусств», Минск, Беларусь*

**ИССЛЕДОВАНИЕ ВОЕННОГО ПРОШЛОГО БЕЛОВЕЖСКОЙ ПУЩИ – НАПРАВЛЕНИЕ В ОРГАНИЗАЦИИ МОЛОДЕЖНЫХ ПРОЕКТОВ**

Путь инновационного развития Республики Беларусь тесно связан с проектно-исследовательской деятельностью студенческой молодежи. Выделим направления организационной деятельности, способствующие развитию участия молодежи в научно-исследовательских проектах:

– организация и проведение научных молодежных мероприятий (студенческие научные конференции, симпозиумы, научные форумы) и др.;

– содействие развитию инновационной активности молодежи с привлечением ее к участию в научно-исследовательских конкурсных проектах, например, таких как Республиканский молодежный проект «100 идей для Беларуси», Республиканский конкурс научных работ студентов, Международный молодежный проект государств Содружества «100 идей для СНГ» и др.;

– координация взаимодействия молодежи, обучающейся в университете, с внешними научными сообществами, организа-